ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 11 (979) | ПАНЯДЗЕЛАК, 13-га студзеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Пленум ЦК КП(б)Б, заслухаўшы фармацыю т. ВАСІЛЕВІЧА аб зыцыі тав. Чарвякова ў барацьбе правым ухілам і нацыянал-дэмаатызмам, аднагалосна зацьвер-іў наступную рэзалюцыю Бюро К і прэзыдыуму ЦКК па гэтым таньні:

1. Уся КП(б)Б, пад кіраўніцтвам К, праводзіла і вядзе самую раучую барацьбу супроць правага ілу і нацыянал-дэмократызму ў орыі і на практыцы. У гэтай бацьбе партыйная арганізацыя дзвычайна чула і патрабоўна носіцца да партыйнага кіраўтва і да паасобных членаў яго, трабуючы выразнай партыйнай ніі і актыўнага ўдзелу ў бацьбе супроць ухілістых ад партыйнай лініі і прымірэнцаў да іх. саблівa гэтая патрабоўнасьць ртыйных мас павышаецца ў адсінах да кіруючых таварышоў, ідомых арганізацыі, але ня прыючых актыўнага ўдзелу ў бацьбе, хоць адкрытыя выступлень- іх палітычна абавязковы, таму то самі гэтыя таварышы рабілі у даўнім мінулым опартуністычныя амылкі.

2. Так, на Менскім, Віцебскім, эмельскім і інш. актывах і шматкіх партсходах, асабліва ў апошні іс, члены партыі ў запісках і выступленьнях высоўвалі супроць Чарвякова (члена бюро ЦК) абнавачаньне ў тым, што ён ня ымае актыўнага ўдзелу ў бацьбе супроць правага ўхілу і ацыянал-дэмократызму, і тлумаалі гэта тым, што т. Чарвякоў ват у пэрыяд абвостранай бацьбы партыі з правым ухілам і цыянал-дэмакратызмам у артылах і выступленьнях выказваў і зраняў права-апартуністычныя і ацыянал - опартуністычныя по-іяды.

3. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК П(б)Б, абгаварыўшы пазыцыю Чарвякова па пытаньнях барацьбы з правым ухілам і нацыял-дэмакратызмам, устанаўляюць сутнасьць актыўнагаў дзелу тав. рвякова ў барацьбе з правым ілам і нацыянал-дэмакратызмам што тав. Чарвякоў на працягу ўгага перыяду і да апошняга часу ў радзе выступленьх вусных і ў друку выказваў і зараняў рад няправільных права-хілісцкіх установак. Гэтыя правахілісцкія ўстаноўкі, узятыя ў воле (у цэлым), об'ектыўна прадаўляюць сабою цэлую сыстэму рава-апартуністычных і нацыянал-партуністычных поглядаў.

4. Гэтыя права-опартуністычныя нацыянал-опартуністычныя поляды і ўстаноўкі тав. Чарвякова айшлі свой адбітак у прыватасьці ў наступным:

1) У суадпаведнасьці з лёзунгам ухарына „обогащайтесь“, тав. арвякоў на VII зьездзе саветаў ССР у маі 1925 г. выступіў з лёунгам: „Багацей, селянін, здабыай больш багацьця, і чым больш ы будзеш багаты, тым больш агата будзе наша савецкая, рабоча-сялянская дзяржава“.

2) Сьледам за Бухарыным, тав. арвякоў угледжваў крыніцы наых хлебных цяжкасьцяў у першую чаргу ў тым, што „зернявыя прадукты ў сэнсе цэн былі пасаўлены нашай палітыкай у недастатна здавальняючыя ўмовы“ прамова 20 кастрычніка 1928 г. на зьезьдзе „Прэч няпісьменнасьць“).

3) Пасьля апублікаваньня Бухарыным „Записок экономиста“, тав. Чарвякоў такім чынам выявіў сваю салідарнасьць з права-опортуністычнымі поглядамі Бухарына: „Мы, таварышы, перажываем ужо досыць доўгі час значныя цяжкасьці ў забесьпячэньні гораду і вёскі хлебам і іншымі сельскагаспадарчымі прадуктамі. Разам з тым, мы перажываем сур'ёзныя цяжкасьці ў забесьпячэньні гораду і вёскі таварамі фабрычна-заводзкай вытворчасьці. Чым гэта тлумачыцца і дзе знайсьці прычыны гэтых цяжкасьцяў? Нядаўна ў цэнтральных газэтах быў надрукаваны артыкул т. Бухарына „Записки экономиста“, у якім ён робіць аналіз усім пытаньням, зьвязаным з гэтай праблемай. Я, таварышы, адсылаю ўсіх вас да гэтага артыкулу, які, памойму, патрэбна ўважліва вывучыць і на падставе якога патрэбна шукаць спосабаў для растлумачэньня ўсіх зьявішч нашага сучаснага гаспадарчага становішча“.

4) Тав. Чарвякоў змазваў кіруючую ролю ва ўсім соцыялістычным будаўніцтве рабочае клясы. Так, напрыклад, на зьезьдзе аграномаў 26 студзеня 1929 г. тав. Чарвякоў, кажучы аб неабходнасьці ўздыму сельскае гаспадаркі, бачыў нашу перавагу перад капіталістычнымі дзяржавамі ў галіне вырашэньня гэтае задачы ў наступным: „Нам патрэбна, мы можам і павінны ісьці ўперад па шляху разьвіцьця сельскае гаспадаркі больш буйным крокам, больш паскораным тэмпам, чым ішлі капіталістычныя дзяржавы. Для гэтага ў нас ёсьць усё неабходнае—папершае, высока разьвітая навука, другое—высока разьвітая тэхніка і трэцяе—неабходнасьць хутчэйшага вырашэньня задач соцыялістычнага будаўніцтва“. Аб дыктатуры пролетарыяту, аб рабочай клясе і яе партыі—кіраўніку гэтага будаўніцтва—асноўнай умове посьпеху высокіх тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва—тав. Чарвякоў нічога не сказаў.

5) Тав. Чарвякоў затушоўваў вядучую ролю прамысловасьці і ў першую чаргу цяжкой індустрыі ў перабудове на соцыялістычнай аснове сельскае гаспадаркі. Так, напрыклад, тав. Чарвякоў кажа на VII зьезьдзе саветаў у 1925 г.: „Першае, што нам патрэбна рабіць—гэта ўсімі спосабамі дапамагаць разьвіцьцю нашае сельскае гаспадаркі, другое—дапамагаць разьвіцьцю нашае прамысловасьці як буйнай, так і саматужнай і рамесьленай“.

6) Тав. Чарвякоў не разумее ўсёй мэханікі клясавае барацьбы на вёсцы і яе няўхільнага абвастрэньня ў сучасны пэрыяд соцыялістычнай рэканструкцыі. Так, у сваім выступленьні на зьезьдзе „Прэч няпісьменнасьць“ у 1928 г. т. Чарвякоў даў няправільную ацэнку шалёнаму супраціўленьню капіталістычных элемэнтаў і ў першую чаргу кулацкіх соцыялістычнаму наступленьню, сказаўшы: „У некаторых колах нашага сялянства ёсьць адпор у справе колектывізацыі, коопэраваньня і наогул аграмаджаньня сельскае гаспадаркі“.

7) Тав. Чарвякоў замест таго, каб падкрэсьліваць кіруючую ролю рабочае клясы ў соцыялістычным будаўніцтве, клясавае расслпластаваньне сялянства (бядняк, серадняк, кулак) лічыў за лепшае ў сваіх прамовах усё гэта замяняць выразамі: „насельніцтва“, „народ“. Ен лічыць магчымым у 1928 г. пісаць наступнае: „Цяжкі лёс выпаў на долю Беларусі. Разбурэньні вайной, цяжкая акупацыя немцаў і, урэшце, здрадніцкая палітыка Рады—усё гэта выключна паслабіла сілы НАРОДУ“.

8) Тав. Чарвякоў ідэалізуе буржуазныя нацыянальныя дарэвалюцыйныя партыі Беларусі, прадстаўляе справу такім чынам, што КП(б)Б працягвае справу гэтых буржуазна-нацыяналістычных партый. Ён у 1928 г. казаў: „Рэвалюцыя патрабавала пераацэнкі ўсяго старога, патрабавала яснага адказу на пытаньні: ці старыя традыцыі і шыльды бяз зьмены зьместу старых лёзунгаў... ці даць старой шыльдзе „адраджэньня“ новы зьмест, паставіўшы яе на службу сацыялістычнай рэвалюцыі і праз гэта захаваць цесную сувязь з рэволюцыйнымі рабочымі і сялянствам“.

9) У сваёй прамове, прысьвечанай 5 гадавіне ўтварэньня БССР, тав. Чарвякоў няправільна трактуе пытаньне аб Рыскім міры і гэтым дае падставу лічыць, што ён лічыць віноўнікам падзелу Беларусі мірную палітыку Савецкага Саюзу. „Я не кажу ўжо аб тым, што Савецкая Беларусь, адзіны эканамічны, нацыянальны і культурны арганізм на падставе Рыскага дагавору, для таго, каб забясьпечыць заключэньне міру, забясьпечыць мобілізацыю сіл супроць наступаўшага Ўрангеля, была штучна разрэзана на дзьве часткі. Ясна, што ўсё гэта павінна было адбіцца на аднаўленьні народнае гаспадаркі Беларусі і легчы надзвычайна цяжкім каменем на эканамічны і культурны арганізм Беларускае рэспублікі“ (прамова 31-га сьнежня 1924 г.).

Тав. Чарвякоў асуджае палітыку нашае партыі ў адносінах да контр-рэвалюцыйных беларускіх арганізацый (беларускі нацыянальны конгрэс у 1917 г.). Ён кажа: „Абстаноўка работы конгрэсу і асабліва спыненьне гэтай работы выклікалі вялікае абурэньне нават сярод шчырых прыхільнікаў саветаў“. („Полымя“ 1928 г.).

10) Тав. Чарвякоў падмяняе пролетарскі характар Кастрычнікавай рэвалюцыі у Беларусі дробна-буржуазным, калі гаворыць: „Агонь Кастрычнікавай рэвалюцыі надаў сілы паэту (гутарка ідзе аб Жылуновічу), бо ён адчуваў сваю блізкасьць да РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ“.

„Рэвалюцыя (Кастрычнікавая) прышла ад цяжкасьці сох“ („Полымя“ 1928 г.). Тав. Чарвякоў няправільна прыпісвае інтэлігенцыі ролю гегемона ў рэволюцыйнай барацьбе і ў падрыхтоўцы Кастрычніцкай рэволюцыі: „Для нас асабліва каштоўны ўсе тыя рэвалюцыйныя сілы (інтэлігенцыя), якія ў той час (у час царызму) працавалі, бо яны, разьвіваючы рэволюцыйны рух сярод сялянства, афармлялі яго, стваралі ўсё большыя прырывкі паміж царызмам і сялянствам і падрыхтоўвалі тую глебу, без якое заваёвы комуністычнай партыі і сялянства не прайшлі-б так лёгка, як яны прайшлі ў годы 17, 18, 19“ (з прамовы т. Чарвякова 31 сьнежня 1924 г.). І, нарэшце, у артыкуле аб Цішку Гартным („Полымя“ 1928 г.) тав. Чарвякоў піша: „З першых-жа дзён Кастрычніка ён стаў на шлях Кастрычнікавай рэвалюцыі, разьбіўшы аўтарытэтам старога „нашаніўца-адраджэнца“ адзіны нацыянальны супроцьсавецкі беларускі фронт“.

11) Гэтую сэрыю права-опортуністычных і нацыянал-опортуністычных поглядаў і ўстановак тав. Чарвякоў папоўніў выступленьнем на XII зьезьдзе партыі з тэорыяй уступак інтэлігенцыі.

12) Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК лічаць неабходным, каб тав. Чарвякоў тэрмінова падверг усе свае права-опортуністычныя і нацыянал-опортуністычныя ўстаноўкі простай, рашучай, бальшавіцкай самакрытыцы ў суадпаведнасьці з пастановамі верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б і лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б).

Пад узьдзейнасьцю партыйнай грамадзкасьці і ЦК тав. Чарвякоў прызнаў свае права-опортуністычныя і нацыянал-опортуністычныя памылкі і галасаваў за публікуемую рэзолюцыю на аб'ядналым пасяджэньні Бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК і на пленуме ЦК.

Комсамол на лесазагатоўках

50-тысячная армія комсамолу спаткала з боку лесазагатоўчых організацый бязьдзейнасьць і нядбайнасьць, якая мяжуецца са шкодніцтвам

БЮРО ЦК УсеЛКСМ СТАВІЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ ПРЫЦЯГНЕНЬНІ ВІНАВАТЫХ ДА АДКАЗНАСЬЦІ

МАСКВА, 9. З дакладу вясковага аддзелу бюро ЦК УсеЛКСМ аб лесазагатоўках высьвятлілася, што на лесазагатоўкі мобілізавана 50 тысяч комсамольцаў. Лесазагатоўчыя організацыі не змаглі прыняць гэтую армію комсамольцаў. Комсамольцы апынуліся ў надзвычайна дрэнных жыльлёвых і бытавых умовах. Яны спаткалі бязьдзейнасьць і нядбайнасьць, якія мяжуюцца са шкодніцтвам.

Ня гледзячы на ўсе гэтыя недахопы, першыя вынікі работы комсамольцаў станоўчыя. Частка маскоўскіх комсамольцаў перавыканала ўстаноўленую для мясцовых лесарубаў норму тры з паловай кубамэтраў у дзень.

Бюро ЦК УсеЛКСМ прызнала, што важнейшая прычына нявыкананьня вытворчых програм лесазагатовак—гэта нядбайнасьць і бязьдзейнасьць лесазагатоўчых організацый, якія мяжуцца са злачынствам.

Вырашана прасіць упаўнаважанага савету працы і абароны па лесазагатоўках тав. Шуркова аб прыцягненьні вінаватых да адказнасьці. Пастаноўлена камандыраваць адказных работнікаў ЦК УсеЛКСМ з упаўнаважанымі УсеЛКСМ і савету працы і абароны для праверкі становішча лесазагатовак і прыняцьця тэрміновых мер. Перад НК РСІ паставіць пытаньне аб правядзеньні тэрміновай праверкі і чысткі лесазагатоўчых організацый зьверху да нізу і аб скарыстаньні ў гэтых мэтах «лёгкай кавалерыі», комсамолу і брыгад ЦК сельска гаспадарчых рабочых.

Магутныя клясавыя баі разгортваюцца

На нажым капіталу французскі пролетарыят адказвае баявым контр-наступленьнем

Французская буржуазія, падобна амэрыканскай, працягвае хваліцца мнімым „росквітам“. Аднак, казка аб „росквіце“ Францыі ўжо даўно разбурана сапраўднасьцю.

Крызіс капіталістычнага сьвету давёў да крайняй жорсткасьці барацьбу на сусьветных рынках паміж капіталам розных краін. У гэтай барацьбе кішэня французскай буржуазіі надзвычайна пацярпела. На шмат якіх рынках французскія тавары аказаліся выціснутымі, альбо адціснутымі на другі плян. Апошнія месяцы мінулага году вываз з Францыі ўпаў так, як ніколі яшчэ ня падаў да гэтага часу.

Свае страты французскі капітал хоча вярнуць, бязумоўна, за лік рабочай клясы. Гэты манэўр прарабліваецца рознымі шляхамі: з аднаго боку—нажым на зарплату і капіталістычная „рацыяналізацыя“, з другога—паніжэньне падаткаў на капітал і павышэньне падаткаў на прадметы масавага спажываньня, з трэцяга—павышэньне цэн на прадметы штодзённага абыходу.

Аднačасова Францыя перажывае востры сельска-гаспадарчы крызіс. Дробныя сяляне-земляўласьнікі і вінакуры — разбураюцца. Скарачаецца ўнутраны рынак збыту. Капітал церпіць новыя страты і яшчэ больш узмацняе свой нажым.

На гэты нажым капіталу французскі пролетарыят адказвае баявым контр-наступленьнем. Магутныя клясавыя баі разгортваюцца. Буржуазія прыбягае да дапамогі паліцыі, турэмшчыкаў і... соцыял-фашыстых. Яна пагражае таксама пусьціць у ход войскі. Але наўрад ці гэтая апора будзе надзейнай: дэмонстрацыі запасных салдат у часе лягерных збораў і настроі ва флёце прадракаюць магчымасьць жорсткіх расчараваньняў для капіталу. Запалохаць-жа рабочых яму ня ўдасца. Пролетарыят будзе разгортваць сваю барацьбу да перамогі.

340 тысяч беспрацоўных у Аўстрыі

...НА, 11. У Аўстрыі працягваецца катастрафічны рост беспрацоўя. Лік афіцыйна зарэгістраваных, тых якія атрымоўваюць дапамогу беспрацоўных дасягае 227 тысяч чалавек. У сапраўднасьці маецца яшчэ ня менш 110 тысяч беспрацоўных г. зн. агульны лік іх—каля 340 тысяч.

Для такой маленькай дзяржавы, як Аўстрыя, гэта—вялізарная лічба. Разам з тым, масавае звальненьне рабочых працягваецца.

У сувязі з ростам беспрацоўя аўстрыйская компартыя высунула наступныя лёзунгі: барацьба за 7-гадзінны працоўны дзень, баявыя камітэты для барацьбы супроць масавых звальненьняў, дэмонстрацыі беспрацоўных, барацьба за павышэньне дапамогі беспрацоўным.

100 тысяч рабочых выкінуты на вуліцу

БЭРЛІН, 12. Саюз нямецкіх табачных гандляроў пастанавіў звольніць 100 тысяч служачых і рабочых, матывуючы тым, што павышаны акцыз на табак дае зусім мала прыбытку, што вымушае скараціць опэрацыі.

Вялікі рост беспрацоўя ў Бэрліне

БЭРЛІН, 12-1. Па афіцыяльных вестках лік беспрацоўных у Бэрліне за апошні тыдзень сьнежня падняўся да 293 тысяч, з якіх толькі 177 тысяч атрымоўваюць дапамогу.

Падрыхтоўка да тыдню Леніна і Лібкнэхта на 21 студзеня. Рыхтуюцца масавыя сходы рабочых

СТАКГОЛЬМ, 12. Кампартыя Швэцыі вядзе падрыхтоўку да тыдню Леніна і Лібкнэхта, які пройдзе пад лёзунгам бальшавізацыі партыі і актывізацыі фабрычна-заводзкіх кам'ячэек. Да кампаніі прыўрочана вярбоўка новых членаў партыі. На шмат якіх заводах упяршыню выйдуць насьценныя газэты, прысьвечаныя Леніну.

21 студзеня ў Стакгольме і іншых гарадох адбудуцца масавыя сходы рабочых.

Сутычка былых латышскіх стралкоў з паліцыяй

РЫГА, 12. Саюз былых латышскіх стралкоў наладзіў у памяць крывапралітых баёў пад Рыгай паход на брацкія магілкі, дзе пахаваны ахвяры імпэрыялістычнай вайны. Калі пасьля прамоў былыя стралкі рабочыя, падняўшы чырвоны сьцяг запелі Інтэрнацыянал, па іх з гумовымі дубінкамі абрушыўся атрад пешай і коннай паліцыі. Дэманстранты аказалі паліцыі супраціўленьне, але ўсё-ж былі разагнаны і зьбіты. Арыштава 9 чалавек.

За два гады загінула 800 тысяч чалавек

ПЭЙПІН, 12. Па паведамленьні друку ў правінцыі Шэнсі ў апошнія два гады згінула ад навальных бядот 800 тысяч чалавек. Па паведамленьнях з Сіюана толькі ў гэтым раёне памерла зімою 15000 чалавек ад голаду і адсутнасьці адзеньня.

Крывавыя сутычкі рабочых-абутнікаў з паліцыяй

Ёсьць шмат параненых дэмонстрантаў

НЬЮ-ЁРК, 12. Паміж забаставаўшымі рабочымі абутковай прамысловасьці, якія належаць да лігі прафсаюзнага адзінства, і паліцыяй, што прабавала разагнаць пікеты забастоўшчыкаў, адбылася сутычка. Абараняючыся ад напаўшых полісмэнаў, дэмонстранты адабралі ў іх дубінкі і зьбілі трох полісмэнаў. Спэцыяльна выкліканымі паліцэйскімі рэзэрвамі дэмонстраны былі разагнаны і зьбіты. Паранена і арыштавана шмат дэмонстрантаў.

Іскры радыё

— У Афганістане, у правінцыі Гугімадан, ізноў выбухнуў паўстанцкі рух.

— За апошнія тыдні наглядаецца шалёнае абвастрэньне паліцэйскага тэрору супроць комуністычнага руху ў Бэрліне.

Усе сілы і ўвагу справе контрактацыі

Кампанія контрактацыі збожжа і іншых відаў сельска-гаспадарчай продукцыі, якая павінна заняць значнае месца ў надыходзячую вясновую пасеўкампанію зьяўляецца важнейшай гаспадарчай і палітычнай задачай партыйных, коопэрацыйных і савецкіх організацый.

Контрактацыя ў нашых умовах зьяўляецца адным з тых вагароў эконамічнага ўзьдзейнічаньня на разьвіцьцё сельскай гасвадаркі ў напрамку яе колектывізацыі, у напрамку пашырэньня тых культур сельскай гаспадаркі, якія даюць больш гаспадарчы эфэкт ва ўсёй сыстэме соцыялістычнага будаўніцтва.

Контрактацыя—дзейны вагар у плянаваньні сельскай гаспадаркі, якая забясьпечвае прамысловасьць патрэбнай сыравінай.

Зусім няправільна думаць, што контрактацыя ёсьць дагаворанасьць двух бакоў—дзяржавы і сельска-гаспадарчага таварыства або бядняцка-серадняцкай гаспадаркі. Усе мерапрыемствы, якія ставіць урад правесьці і ўнядрыць у сельскую гаспадарку, як-та крэдытаваньне, забесьпячэньне гатунковым насеньнем, ужываньне агра-мінімуму і зоотэхнікуму і іншых мерапрыемстваў, якія зьвязаны з контрактацыяй, зьяўляюцца сродкам узьняцьця сельскай гаспадаркі і сродкам больш шпаркага прасоўваньня яе па шляху колектывізацыі, па шляху перабудовы вёскі на соцыялістычны лад.

Тое, што заключэньне контракту гэтага году мае на мэце організацыю зямельным таварыствам на працягу пэўнага часу колгасу альбо прасьцейшага сельска-гаспадарчага таварыства ёсьць паказчык важнасьці справы контрактацыі ў цяперашні час.

Контрактацыя мінулых гадоў у адносінах усяе сельска-гаспадарчае продукцыі займала нязначнае месца. КОНТРАКТАЦЫЯ МІНУЛАГА ГОДУ ГЭТА ВОПЫТ, ЯКІ СЯБЕ ЦАЛКАМ АПРАЎДАЎ. У гэтым годзе справа контрактацыі прымае шырокія памеры.

Беларусь па заданьню Наркамгандлю СССР павінна законтрактаваць 300 тысяч гэктараў сельска-гаспадарчых культур вясновай сяўбы і нават 100 проц. ахопленьне контрактацыяй некаторых культур.

Такі размах контрактацыі вымагае ад партыйнай і ўсяе савецкае грамадзкасьці ў першую чаргу апарату сельска-гаспадарчай коопэрацыі мобілізацыі ўсіх сіл усяе ўвагі на гэты вучастак нашай работы, як на адзін з адказьнейшых вучасткаў сельска-гаспадарчай кампаніі 30 году.

КОМСАМОЛЬСКІЯ КАМІТЭТЫ І ЯЧЭЙКІ ЗАРАЗЖА ПАВІННЫ ДАЦЬ ЛЕПШЫЯ СІЛЫ НА ПРАЦУ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНЮ КОНТРАКТАЦЫІ.

Работа па давядзеньню пляну контрактацыі да вёскі павінна была быць скончана да 15-га студзеня, а ўся работа па заключэньню дагавароў павінна быць скончана да 1-га сакавіка. Таму ўдзел комсамольскіх ячэек і асобнага комсамольца ў гэтай працы ёсьць неадлучная частка штодзённай работы па ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі, якія пастаўлены ў правядзеньні пасеўнай кампаніі.

Брыгады, якія будуць пасланы акругкомамі і райкомамі комсамолу на вёскі для правядзеньня пасяўной кампаніі ў сваёй рабоце па выкананьню задач пасяўной кампаніі павінны аказаць практычную дапамогу адпаведным організацыям у справе контрактацыі культур вясновай сяўбы.

Колгас, савгас і бядняцка-серадняцкая маса насельніцтва павінна ведаць, што ім дае дзяржава і памятаць узятыя на сябе дагаворам абавязкі перад дзяржавай.

У вёсках сельсавету і раёнах суцэльнай колектывізацыі дагавары на контрактацыю не заключаюцца з кулацкімі гаспадаркамі, пасяўная плошча якіх вылучана ў асобны клін, дагавары, якія заключаны з зямельнымі таварыствамі распаўсюджваюцца толькі на бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, якім будуць дадзены контракцыйныя кніжкі. Кулацкім гаспадаркам, якія ўваходзяць у земтаварыства, асобнай пастановай таварыства даецца пэўнае заданьне па выкананьню агрaмінімуму і здачы ім лішкаў усіх культур дзяржаўным організацыям.

Ніякіх дагавароў па контрктацыі мы з кулаком не заключаем. Усе агразоотэхнічныя мерапрыемствы, якія прадугледжаны ў дагаворы з бядняцкай і серадняцкай часткай вёскі, павінны быць выкананы кулацкай гаспадаркай. Кулак здае ўсе лішкі, але ня менш самай вышэйшай нормы, якая вызначана данаму паселішчу. Кантроль за выкананьнем гэтых пунктаў кулацкімі гаспадаркамі ўскладаецца на сельсаветы.

Палітыка партыі і Савецкай улады ў адносінах да кулака па пытаньнях контрактацыі, як і ва ўсіх іншых пытаньнях соцыялістычнага будаўніцтва сустрэне супраціўленьне з боку кулака.

Вылазкам кулака мы павінны будзем даць рашучы адбой, мобілізуючы на гэта батрацкія, бядняцкія і серадняцкія масы сялянства. Трэба дабіцца выразнасьці работы ў першую чаргу сельска-гаспадарчай коооэрацыі, забясьпечыўшы яе людзьмі, якія-б на справе ажыцьцяўлялі генэральную лінію партыі. Усё гэта патрабуе ад комсамольскай організацыі пасылкі лепшай сваёй часткі на гэты вучастак работы.

Т. ГАЛОДКА.

Буйныя прарывы

ў рабоце гомельскага акрсавету фізкультуры

Характэрнай асаблівасьцю апошняга пленуму ВСФКБ зьяўляецца тое, што як ніколі з усёй вастрынёй было пастаўлена пытаньне аб узмацненьні росту за кошт рабочых, батракоў, беднякоў і серадняцкіх мас вёскі, аб клясавым выхаваньні фізкультурнікаў, удзеле апошніх у грамадзка-палітычным жыцьці і сьмелым высоўваньні пролетарскіх кадраў на кіруючую фізкультурную працу.

З часу пленуму прашло 6 месяцаў.

Ня гледзячы на некаторы зрух у галіне выкананьня пастаўленых задач, мы, як ужо раз адзначалі, ня можам канстатаваць, што фізкультурны рух прыведзен у суадпаведнасьць і поўнасьцю выконвае задачы, вынікаючыя з рэконструкцыйнага пэрыоду.

ВЫНІКІ ПАЛІТЫЧНАЙ БЛІЗАРУКАСЬЦІ АКРУГОВАГА САВЕТУ

У гэтым артыкуле мы жадаем асьвятліць адзін з буйных прарываў у фізкультурнай працы Гомеля, да якога прывяла бязідэйнасьць, палітычная блізарукасьць акруговага Савету фізкультуры.

Ня гледзячы на наяўнасьць вялікіх кадраў рабочых, згуртаваных на цэлым шэрагу буйных і дробных прадпрыемстваў, узросшы інтарэс да фізкультуры і параўнаўча спрыяючыя матар'яльныя ўмовы (стадыёны, пляцоўкі і клюбы), савет не скарыстаў гэтых магчымасьцяў і ня мог упраўіцца з задачай масавага ахопу шырокіх рабочых мас гуртковай і масавай фізкультпрацаю. Наадварот, лічбы гавораць аб памяншэньні колькасьці ф. к. з красавіка па кастрычнік 1929 году на 854 чал., з якіх 570 рабочых, партыйная праслойка паменшылася на 190 чал. У такіх буйных прадпрыёмствах, як фабрыка „Везувий" (Нова-Беліца), дзе налічваецца 1800 рабочых у гуртку займаецца 50 чал., на фабрыцы „Гэрой Працы" (Добруш) з 1500 рабочых у гуртку 115 чал. і інш. Гэтакіх прыкладаў шмат.

БЯЗ РУЛЯ І БЕЗ ВЕТРЫЛ...

Хуткі тэмп колектывізацыі сельскай гаспадаркі на грунце пастаноў партыі таксама ня быў улічан і ня стаў асноўным пытаньнем для савету ў разгортваньні фізкультурнай працы на вёсцы, аб гэтым гаворыць амаль што поўнае адсутнічаньне колгаскіх гуртоў (на 120 колгасаў—3 гурткі!), агульная слабасьць працы па ахопу бядняцка-батрацкіх і серадняцкіх мас сялянства фізкультурай. Савет не кіраваў працаю райсаветаў ФК і гуртоў, слаба дапамагаў апошнім і не вывучаў соцыяльнага твару вясковых фізкультурнікаў. Бязумоўна, гэтакія адносіны да росту і яго, якасьці прывялі да зьніжэньня колькасьці рабочых у гуртках, недапушчальна слабаму росту гуртоў на вёсцы ў соцыялістычным яе сэктары, а галоўнае да таго, што гурткі засьмечаны клясава-варожым элемэнтам.

Гурткі ў сувязі з сваёй замкнутасьцю і пераважнасьцю ў працы спортыўных элемэнтаў, ня ўдзельнічалі ў грамадзка-палітычным жыцьці і слаба займаліся пытаньнямі соцыялістычнага спаборніцтва, падняцьця вытворчасьці працы, барацьбы з прагуламі, за зьніжэньне сабекошту, палепшаньне якасьці прадукцыі і г. д.



Больш таго, савет не займаўся пытаньнем палепшаньня якасьці клясавага выхаваньня фізкультурнікаў, не мабілізаваў увагі апошніх і сам не рэагаваў на зьявішча чэмпіонства, рэзкага антаганізму паміж гурткамі (горад—Залінейны раён), антысэмітызму і шовінізму, і так званага очковціраўцельства.

АКРУГОВЫ САВЕТ ПРЫКРЫВАЎ ЧУЖАКОЎ

Усімі гэтымі недахопамі хварэе цэлы шэраг гуртоў, а савет быў „заняты" чымсьці іншым, а чым, трудна тлумачыць, бо і гэткае вострае пытаньне, як падрыхтоўка пролетарскіх кадраў таксама невыпадкова выпала з пункту гледжаньня савету фізкультуры. Зьвернемся да прыкладаў. На 50 інструктароў маецца 7 рабочых, якія сустракаюць супраціўленьні старай часткі інструктароў, з думкамі, што гэтыя рабочыя "інструктары ўноў выпечаныя", „па сваёй кваліфікацыі не адпавядаюць прызначэньню, якім неабходна яшчэ павучыцца ў прафэсара". Савет ня даў належнага адпору гэтым настроям і ня гледзячы на наяўнасьць жаданьня ў значнай праслойкі рабочых актывістаў фізкультурнікаў актыўна ўдзельнічаць у працы, не скарыстаў гэта і не праявіў належнай рашучасьці ў высоўваньні рабочых на актыўную фізкультурную працу. Ня было праведзена адпаведнай працы па ачыстцы інструктарскіх кадраў ад соцыяльна-варожых элемэнтаў. У сучасны момант працуюць: сын буйнага гандляра (Рэчыца) сын быўшага галавы г. Гомеля, дачка палкоўніка і інш. Калі да гэтага дабавіць тое, што пытаньнямі ўзьняцьця ідэйна-палітычнага ўзроўня інструктароў і прыцягненьня апошніх да ўдзелу ў грамадзка-палітычным жыцьці таксама ніхто не займаўся, дык стане зусім яскравым, з якімі „кадрамі" працаваў Гомельскі Савет ФК.

Яскравым показам поўнага развалу работы савету ФК служыць тое, што апошні на працягу паўтара гадоў не зьбіраўся на Пленум і 7 месяцаў ня было паседжаньняў Прэзыдыуму. Да працы савету ня былі прыцягнуты пролетарская частка фізкультурнікаў і актыву.

Бязумоўна, за ўсе гэтыя буйныя палітычныя прарывы, за ўсю гэту права-опортуністычную практыку, адказваюць ня толькі старшыня савету, тав. Муха і Намесьнік Старшыні тав. Дзягель. Трэба адкрыта прызнаць, што вялікая доля адказнасьці кладзецца на Акругком партыі, Акругком Комсамолу, Акрвыканком і Акрпрофсавет. Няўжо за цэлы год гэтыя аўтарытэтныя органы не змаглі прыкмеціць куды скатываецца кіраўніцтва фізкультурным рухам. Магчыма, што заслухоўваньнем дакладаў аб посьпехах на спаборніцтвах абмяжоўваліся Акрвыканком, Акрпрофсавет і Акругком Комсамолу. Між іншым новы склад бюро Акругкому КСМ прыцягнуў комсамольскі і фізкультурны рабочы актыў к выяўленьню сапраўднага становішча Савету Фізкультуры, тым самым выправіўшы памылкі мінулага складу бюро.

НЕАБХОДНЫЯ ВЫВАДЫ

Трэба зараз-жа зьмяніць кіраўніцтва Акруговага Савету. Партыйным, комсамольскім, профэсійным і савецкім організацыям трэба узмацніць штодзённае кіраўніцтва фізкультурнай працаю. Вурок Гомеля павінны ўлічыць усе Саветы Фізкультуры. Зараз неабходна кіравацца тым, што ў умовах рэконструкцыйнага пэрыяду фізкультурны рух, як гэта вынікае з пастаноў ЦК УсеКП(б) павінен ахапіць шырокія масы рабочай клясы, пранікнуць у колгасы і савгасы і прыцягнуць батрацка-бедняцкія і серадняцкія слаі вёскі.

Фізкультурнікі ня могуць і не павінны стаяць у баку ад грамадзка-палітычнага жыцьця.

Як ніколі, перад фізкультурным рухам стаіць войстра пытаньне аб падрыхтоўцы пролетарскіх кадраў інструктароў фізкультуры. Організаваць і падрыхтаваць рабочы фізкультурны актыў—вось тыя мерапрыемствы, якія будуць спрыяць палепшаньню соцыяльнага складу кіруючых кадраў фізкультуры і ўсёй работы фізкультуры.

Л.

БОЛЬШ КЛЯСАВАЙ ПІЛЬНАСЬЦІ

ВЫКРЫВАЦЬ І ГНАЦЬ З НАШЫХ ШЭРАГА[ў] усіх тых, хто комсамольскім білетам прыкрывае свой варожы твар

Даўно пара выключыць

У Ветрынскім раёне (Полаччына) пры колгасе „Труд" ёсьць комсамольская ячэйка. Ячэйка па складу невялікая, але сярод яе членаў ёсьць такія, якім ня месца ў комсамоле.

Куксенка Сяргей ня можа быць у шэрагах комсамольскай організацыі па-першае таму, што на працягу доўгага часу не наведваў ячэйковых сходаў, не плаціў сяброўскіх узносаў, а толькі п'янстваваў і ўчыняў неэтычныя паступкі, як комсамолец, дыскрэдытаваў сабою організацыю.

Жывучы блізка каля колгасу ён ня толькі сам ня ідзе ў колгас, а наадварот часта асьмейвае жыц[ьцё] колгасаў кажучы: „што ў колга[сах] жывуць гультаі, турэмшчыкі і г. [д.]"

Калі ячэйка паставіла перад [ім] пытаньне аб тым, каб ён ішоў [у] колгас, дык Кусенка пасьля доў[гіх] спрэчак кінуў на стол свой ком[са]мольскі білет і выкапаць пастано[ву] адмовіўся.

Комсамольская ячэйка, а так[са]ма і райком чамусьці ніякіх за[хо]даў ня робяць.

Ячэйцы трэба было-б даўно [па]ставіць пытаньне аб прабыван[ьні] такога комсамольца ў яе шэрага[х].

Кветачка.

ПАЗБАЎЛЕНЦЫ ПАД ШЫЛЬДАЙ САМАТУЖНІКАЎ

У Лагойскай м. савецкай ячэйцы комсамолу ёсьць дзьве комсамолкі, аб якіх неабходна пагаварыць. Першая—гэта Шуб Малка, дачка дробнага гандляра, які гандлюе ўвесь час цукеркамі і ябыкамі. Дачка гандляра, аб якім стаіць пытаньне ў Лагойскім райвыканкоме, каб пазбавіць яго выбарчых правоў. Шуб Малка пад відам саматужніка пралазіць у КСМ, дзе ёй даручаюць адказную працу, устрайваюць на работу ў міліцыю і па комсамольскай галіне даручаюць абавязкі важатага атрадам ЮП. Работу-ж па выкананьню комсамольскіх абавязкаў не заўсёды добра яна выконвала. Характэрна заўважыць, што пры чыстцы савецкага апарату гэтая «комсамолка» пад відам, што яна зарвала з бацькамі гандлярамі ўсялякую сувязь, пераходзіць на другую кватэру і жыве там да таго часу, покуль ня скончылася чыстка. Пасьля таго, як усё адбылося добра і яна засталася працаваць у савецкім апараце, Шуб Малка ізноў пераходзіць да бацькі, дзе жыве і цяпер.

Увесь час разам са сваёй таварышкай комсамолкай Родштэйн Цыляй, яны ўносяць у ячэйку разлад і абывацельшчыну.

Паглядзім-жа што з сябе уяўляе таварышка.

Родштэйн Цыля таксама пад шы[ль]дай саматужніка, пралезшы ў ко[м]самол, спачатку працуе энэргіч[на], але потым увесь энтузіазм пра[па]дае і яна робіцца звычайнай [ме]шчанкай. Бацька яе і цяпер зь[яў]ляецца рэлігійнай служкай, вядзе рэлігійную работу сярод яўр[эй]скага насельніцтва і аднойчы, адымалі сынагогу пад клюб са[ма]тужнікаў, ён хадзіў зьбіраць п[од]пісы ад насельніцтва, каб ня д[аць] сынагогу. Родштэйн Цыля зам[ест] таго, каб павесьці адпаведную [ра]боту ў сям'і — патурала сва[яму] бацьку.

Вось двойка „комсамолак", я[кія] пралезьлі ў комсамол выключ[на з] мэтай кар'ярызму ўносячы ў яч[эй]ку абывательшчыну, плёткі, аб[ра]ваючы другіх пахабнымі слов[амі]. Учыняюць анты-комсамольскія [па]ступкі, што ні ў якой меры [не] сумясьціма з комсамольскай эт[ыч]насьцю.

Справа Лагойскага райкому [ком]самолу заглянуць у ячэйку і па[ра]радзіць сваечасова ад тых нездa[ро]вых зьявішч, якія могуць уз[ні]куць, калі ў ячэйцы застануцца чужыя нам „комсамольцы".

5 подпісаў комсамольца[ў]

Выклікаем на соцспаборніцтва

БЕДНЯЦКУЮ І СЕРАДНЯЦКУЮ МОЛАДЗЬ ПАДШЭФНАГ[А] СЕЛЬСАВЕТУ І КОМУНЫ „КОМСАМОЛЕЦ"

На менскай швальнай фабрыцы „Акцябр" праведзена вялікая праца па ўцягненьню моладзі ў соц. спаборніцтва, у выніку чаго на фабрыцы організавалі пяць першых ударных брыгад, у склад якіх ўвайшлі комсамольцы, беспартыйная моладзь і некаторая частка дарослых рабочых.

За час соцыялістычнага спаборніцтва рацыяналізатарскімі групамі комсамольскіх ячэяк унесена 31 прапанова. У работу рацыяналізатарскіх груп уцягнута многа рабочай моладзі.

Для ўцягненьня батрацкай, бядняцка-серадняцкай і колгасна-савгаснай моладзі падшэфнага сельсавету і комуны „Комсамолец" у соцыялістычнае спаборніцтва бюро комсамольскага колектыву фабрыкі пастанавіла: 26-га студзеня правесьці сумесную конфэрэнцыю рабочай моладзі фабрыкі, савгаскай і бедняцка-серадняцкай моладзі вёскі, дзе будзе заключан договор па соц. спаборніцтву.

Пункты дагавору абхопяць нашы задачы, як на прадпрыемстве, так і ў вёсцы.

Будзе звернута асаблівая ўвага: 1. На выкананьне промфінпляну на фабрыцы, 2. Выкананьне задач вясеньня-пасеўнай кампаніі і максымальнае разгортваньне працы па колектывізацыі асноўных мас нашага падшэфнага сельсавету.

На фабрыцы пачата падрыхтоўка да гэтае конфэрэнцыі. Выпрацавана адозва да батрацкай і бядняцка-се[ра]дняцкай моладзі падшэфнага с.-са[вету], якая абгаворана і адобрана комсам[оль]скім колектывам і беспартыйнай [мо]ладзьзю фабрыкі.

На гэтым вечары беспартыйная [мо]ладзь вынесла прапанову, каб п[ус]ціць падпісны ліст сярод моладзі ф[аб]рыкі для збору сродкаў на пр[авя]дзеньне конфэрэнцыі. Да конфэрэ[нцыі] на фабрыкі будуць праведзены сх[оды] моладзі, дзе кожная зьмена бу[дзе] абгаварваць догавар і выносіць к[он]крэтныя дабаўленьні да яго. Па ц[эх]ах праходзяць выбары дэлегатаў на [на]мянутую конфэрэнцыю.

Для правядзеньня падрыхтоў[чай] працы колектывам фабрыкі вылуч[аны] тры таварышы, якія выехалі ў в[ёску] і сумесна з комсамольскімі ячэйк[амі] займаюцца выпрацоўкай умовы з б[ел]яскай ячэйкі. Пухавіцкаму р[ай]кому і Блускай комсамольскай яч[эй]цы ня трэба чакаць, а зараз-жа попу[ля]рызаваць значэньне намечаных ме[ра]прыемстваў сярод моладзі.

Конфэрэнцыя адбудзецца 26-га [сту]дзеня ў Блускім сельсавеце ку[ды] выедуць нашы дэлегаты і дэлегаты [ко]муны „Комсамолец".

Блускай і нашай ячэйцы тр[эба] зьвярнуць асаблівую ўвагу на [пад]рыхтоўчую працу да правядзен[ьня] сумеснай конфэрэнцыі.

Сэкратар колектыву ЛКСМБ ф-кі „Акцябр" Хэй[...]

УСЮ ЭНЭРГІЮ КОМСАМОЛУ НА ВЫКАНАНЬНЕ І ПРАВЫШЭНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

Максымальна зьнізіць страты вытворчасьці | Вайна—безалабершчыне, прагулам, браку і простоям

жны проц. зьніжэньня сабекошту продукцыі па БССР дае 3 міл. руб. соцыялістычнаму будаўніцтву. Змагайцеся за выкананьне 5-годкі ў 4 гады

Наварстайце ўпушчанае ў першым квартале

едавыканана 26 проц.

На сёньнешні дзень друкарня олесдруку" налічвае 4 ударных кі і каля 25-30 ударных брыд. Аднак, выкананьне промфіннну друкарні ідзе ня зусім здаьняюча, за бягучы квартал мфінплян недавыканан на 26 пр. Асноўным недахопам зьяўляецца пуск дрэннай якасьці прадукцыі, бліва машынным цэхам.

Трэба з усёй уважлівасьцю прадзець нашы слабыя месцы, і тое, о перашкаджала выкананьню вырчай програмы. Вось гэтыя пекоды.

Папершае. Некаторы прасчот ііністрацыі ў пытаньнях забясьаньня рабочай сілай. У пераным цэху, напрыклад, не хапае нага штату рабочых для выкаьня програмнай работы.

Падругое. Прастоі у машынм, пераплётным цэхах, а ў апошчас вялікія прастоі ў наборным у з-за халатных адносін нашага адстаўніка ў Маскве і адміністцыі, якія ня прынялі належных даў для нагрузкі наборнага цэхаця для гэтага ўсе магчыьці былі.

Па трэцяе. Шкат прагулаў, як хваробе, так і па неўважлівых чынах. Усяго прагуляна 690 авека-дзён. І па-чацьвертае, о замест вызначаных плянам 31 шыны працуе усяго 26-27 ман. Толькі лінавальны цэх выніў програму першага квару на 102 проц.

Апрача прычын выцякаючых з зеньня гаспадаркі, непрадугледжаьці цэхавай адміністрацыі і інш., разам у выкананьні промфінну зьяўляюцца нядбайнасьць, а час прамое шкодніцтва з боку аторай часткі рабочых. Напрыад, ломка машын працягваецца, а мела месца на 3-й зьмене калі кар Каган Э. робячы чыстку шыны на хаду упусьціў ануч, чаго сагнулася вось. Друкар Бухн на машыне № 3 прыправіў рму так, што яна моршчыла пару, у выніку прышлося форму раплавіць.

А вось яшчэ больш агідны факт уважлівасьці. Друкар Воўкінд ыправіў восем балонак тэксту, друкаваў дзьве стапы і ня прыеціў, што вітка рве паперу. Тое-ж пусьцілі друкар Сіпакоў і друкар ыгубаў у выніку прышлося саваць 10 тысяч одціскаў і раплавіць тэкст, бо фарма была праўлена дрэнна.

(„Ратацыя").

Е АДСТУПАЦЬ АД ЗАВАЁВАНАГА

пачатку 28-29 гаспадарчага году передоў каштавала звыш двух блёў. На працягу мінулага гаспарчага году плянам прадугледжвалася нізіць сабекошт передоў да 1 руб. кап. Дзякуючы творчаму энтузіяз рабочых чырвона-дубнага цэху ў ым квартале сабекошт пары перау зьнізіўся до 1 р. 70 кап.

Аднак. першы квартал гэтага гаспарчага году даў зусім дрэнныя вынікі. БЕКОШТ ПЕРАДОЎ ІЗНОЎ ПАВЫСЯ і каштуе больш за 1 р. 80 кап. кім чынам мы сталі здаваць заваёныя ў мінулым годзе пазыцыі на онце зьніжэньня сабекошту.

Тлумачыцца гэта галоўным чынам аторым пасалабленьнем работы на тым вучастку. Гэтага цярпець данельга. Дырэктыва партыі аб зьнінькі на 11 проц. сабекошту павінна ць выканана.

вод „Бальшавік. ДУШАЦКІ.

Зьніжэньнем сабекошту даб'емся мільёнаў для прамысловасьці

(З дакладу Старшыні ВСНГБ тав. Грысевіча аб выкананьні промфінпляну за 1929-30 год на пленуме ЦСПСБ)

Да гэтага часу толькі 30 проц. рабочых Беларусі ахоплена соцыялістычным спаборніцтвам, што зусім недастакова, а пасьпяховае-ж выкананьне промфінпляну 29-30 году у значнай ступені залежыць ад разгортваньня соцыялістычнага спаборніцтва.

Па БССР вызначан рост валавой продукцыі на 76 проц., у капітальнае будаўніцтва маркуецца ўлажыць 52 мільёны рублёў. Будуюцца такія гіганты, як: шкляны завод, Гомельскі сельмашбуд і інш. Мы павялічваем тарпяную прамысловасьць у параўнаньні з мінулым годам на 222 проц., керамічную—на 65,8 проц. Вызначаецца буйны рост тэкстыльнай прамысловасьці. Мы павінны зрабіць з Беларусі чырвоную Лодзь.

ВСНГ вызначыў зьніжэньне сабекошту продукцыі на 11,7 проц., але на гэтым, зразумела, спыняцца нельга. Патрэбна прыкласьці усе сілы, каб зьніжэньне сабекошту было яшчэ большым. **Адзін процант зьніжэньня сабекошту раўняецца 3 мільёнам рублёў, накіраваным на узмацненьне нашай прамысловасьці.** *У першым квартале бягучага году промфінплян* **недавыканан: па мэталяпрамысловасьці на 20 проц., дрэваапрацовачнай—31,9 пр.,** *у шэрагу іншых галін вытворчасьці мы наглядаем такое-ж становішча. Вытворчасьць працы замест вызначаных па пляну 37,9 проц. павялічылася толькі на 26,35 проц.*

Апрача гэтага ў нас яшчэ наглядаецца слабасьць дысцыпліны, ня ўменьне мобілізаваць унутраных рэсурсаў, ня выконваюцца мерапрыемствы па ахове працы. Усе гэта разам узятае бязумоўна перашкаджае пасьпяховаму выкананьню промфінпляну.

Вызначанае партыяй і ўрадам будаўніцтва павінна быць ажыцьцёўлена! Усе сілы на зьніжэньне сабекошту і палепшаньня якасьці продукцыі!

Вось што азначае непадрыхтаванасьць

Гомельскіх „пролетарцаў" бесперапынка застала непадрыхтаванымі

За мінулы год гомельскі завод „Пролетары" выпусьціў на 1.549.000 рублёў продукцыі, што правыша програмныя заданьні на 1.380.000 руб. у параўнаньні з 1: 27-28 гаспадарчым годам. Такіх посьпехаў завод дасягнуў дзякуючы росту вытворчасьці працы больш поўнаму выкарыстаньню абсталяваньня і паленшаньню організацыі працы.

На 1929-30 гаспадарчы год перад заводам пастаўлены яшчэ больш адказныя задачы — павялічэньне продукцыі ў параўнаньні з мінулым годам на 60 проц. Для гэтага заводу патрабуецца 1400 тон чыгуннага ліцьця і 440 тон меднага ліцьця, з забясьпечаньнем гэтымі матар'яламі справа покуль што абстаіць **дрэнна**. Павялічэньне прапускной здольнасьці заводу і пераход на бесперапынку выклікае павялічэньне рабочай сілы на 712 чалавек. Атрымаць гэтую колькасьць рабочых завод зараз амаль што ня мае магчымасьці, гэта выклікае неабходнасьць паскорыць адчыненьне школы фабзавучу пры заводзе.

Безгаспадарнасьць „матушка"

Перад заводам пастаўлена задача каб у бягучым годзе зьнізіць сабекошт на 14-15 проц. Гэтаму перашкаджае налічча безалабарнасьці, безгаспадарнасьці, якія ўсё яшчэ займаюць значнае месца ў жыцьці заводу. Напрыклад, у такарным і сьлясарным цэхах наглядаецца вялікі процант браку. Кацельны цэх дрэнна выконвае разьмеры для растворамяшалак, чым часта выклікаюцца перарабленьні. У многіх цэхах заказы ня выконваюцца сваечасова, а бываюць выпадкі, калі заказы ізноў пападаюць у вагранкі.

На двары валяецца шмат годных матар'ялаў і частак, ляжаць гатовыя заказы і ржавеюць. Напрыклад, валяюцца шасьцяронкі па заказу 1600-61 для рэчыцкай фабрыкі „Днепр". Сотні карпусоў кондэнсацыйных гаршкоў і „Лудло" захаваны пад сьнегам. Больш году валяюцца чурачныя пілы, якія зроблены для фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна". Воданагравацель, зроблены для кліцоўскай фабрыкі лопнуў таксама з за „добрай якасьці". Рабочыя не запаўняюць цалкам 8-гадзінны рабочы дзень, нікуды ня вартае і разьмеркаваньне рабочых па кваліфікацыях. Няма дадатковага тэхнічнага нагляду за работай.

БЕСПЕРАПЫНКА ЗАСТАЛА Ў РАСПЛОХ

Пераход заводу на бесперапынны рабочы тыдзень быў **непадрыхтаваны**. Цэхі, перайшоўшыя на перапынку поўнасьцю не нагружаны, ня гледзячы на тое, што адміністрацыя заяўляла, што гэтага ня будзе. З 28 такарных варштатаў не нагружана 8. Арматурны цэх павінен быў павялічыць выпуск арматуры на 20 проц., а сыравіны не хапае. Няма належнага запасу сыравіны і ў модальным цэху.

Яшчэ больш катастрофічнае становішча ў медналіцейным цэху, **папершае не хапае рабочае сілы, а падругое, зусім адсутнічае сыравіна** Замест 150 пудоў медзі ў дзень патрэбных цэху—ёсьць толькі **150** фунтаў.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што заводакіраўніцтва, партыйныя і профэсыянальныя організацыі заводу пагналіся за формай пераходзячы па бесперапынку, ня ўлічыўшы запасу сыравіны. Вурокі „Пролетарыя" трэба ўлічыць і астатнім заводам, якія будуць пераходзіць на бесперапынны тыдзень.

Ц. В.

Па іх раўняцца



Ударная брыгада менскіх рамонтных майстэрняў МББ чыгункі, якая дабілася вялікіх посьпехаў у скарыстаньні адкідаў і прагулаў у вытворчасьці. Брыгада прэміравана.

ГАНЕБНЫЯ 10 І 20

У кастрычніку і лістападзе сярніковая фабрыка „Везуві" вышла з ГАНЕБНЫМ невыкананьнем вытворчай програмы. Па запалках програма недавыканана на 10 проц., па фанэры—на 20 проц. Дзе прычыны гэтаму зьявішчу?

У наліччы няўвязкі паміж адміністрацыяй цахоў. Часта загадчык аднаго цэху з-за прынцыпаў не жаданьня падначаліцца другому дапускае самыя грубыя памылкі. Напрыклад, загадчык здымальнага цэху дапускае работніцам трымаць пры сябе восем-дзевяць рам, у той час як дазваляецца трымаць толькі чатыры. Трыманьне больш 4 рам выклікае затрымку ў накатальным цэху і бываюць



Рабочы: У цэху прастой сіравіны няма.

Заўком: Я заняты складаньнем сьпісаў на дровы.

выпадкі, што з-за гэтага ўвесь цэх прастайвае поўгадзіны, а калі і гадзіну ў дзень. Ніхто аб гэтых зьявішчах з цэхавай адміністрацыі не паведаміў адміністрацыі фабрыкі.

Налічча часткі рабочых рвацкі настроеных таксама дрэнна адбіваецца на выкананьні вытворчай програмы. Напрыклад, рабочы Бучаеў згодзен удзельнічаць у соцспаборніцтве ТОЛЬКІ ЗА ЎЗНАГАРОДУ.

Ён гаворыць: — „ПРОЦАНТЫ ДАСЬЦЁ, БУДУ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У СПАБОРНІЦТВЕ, А НЕ ДАСЬЦЁ, БУДУ КАТАЦЬ ПА 35 ЗАМЕСТ 50 ВАГАНЕТАК У ДЗЕНЬ". Толькі за 8 сьнежня было прагулена 100 чалавека-дзён, першае месца у гэтым займае здымальны цэх.

Да ўсяго гэтага далучаюцца і падтрымліваюць людзі з яўна варожай нам псыхолёгіяй. СЬВЯЦІЦКІ напрыклад, (да рэчы ён абран старэйшым брыгадзірам) кажа: „НЯ ХОЧУ РАЗУМЕЦЬ НІЯКАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ, КІРАЎНІКІ І КОМУНІСТЫ БЯРУЦЬ У КІШЭНЮ САБЕ ЎСЕ ГРОШЫ, ТАМУ Ў НАС ТАКІЯ ЦЯЖКАСЬЦІ". А вось ПІСАРЭНКА РЫГОР дадамаўся да таго, што зацьвярджае і „быццам пяцігодка прывядзе краіну да жабрацтва, голаду і вайны" (!?). Такіх тыпаў на фабрыцы на вялікі жаль многа.

Заданьні другога году пяцігодкі павінны быць выкананы, для гэтага патрэбна мобілізаваць усіх рабочых фабрыкі, выкінуўшы ўсіх тых, хто апрануўшыся ў рабочую кашулю праводзіць лінію клясавага ворага.

Н. КЕСЕН.

МЫ ІДЗЕМ У ХВАСЬЦЕ

(„Чырвоная Зорка" Менск)

Пры праверцы старога соц. догавору на заводзе „Чырвоная Зорка" выявілася шэраг недахопаў, якія зьяўляюцца перашкодай у выкананьні промфінпляну.

Пасьля гэтага цэлымі групамі рабочыя зьніжалі расцэнкі, эканомілі паліва, электрычнасьць узрасла колькасьць ударных брыгад. Калі па 1-ае кастрычніка мінулага году ў нас была толькі адна брыгада з 7 чалавек, дык на першае студзеня 30 году мы налічваем 18 ударных брыгад з колькасьцю 132 чалавек.

І ўсе-ж першы квартал бягучага году паказвае, што заданьні ўзятыя на сябе соцдогаварам і промфінплянам ня выконваюцца. Трэба было выпрацаваць афармаваных дражджэй 250 тысяч кілёграм штомесячна. А выпрацавалі за кастрычнік 200974 кілёграмы або 80,8 проц. У лістападзе выпрацавана 184.689 кілёграм, што складае 74 проц. заданьня. Адзін рабочы павінен выпрацаваць у дзень 65 кілёграм дражджэй, выпрацоваў-жа у кастрычніку 59,6 кілёграм, у лістападзе 63,32; ненармальнае становішча і са зьніжэньнем сабекошту.

Нельга не адзначыць тэй ненармальнасьці, што рост заробчай платы ідзе куды шпарчэй чымся падняцьце вытворчасьці працы і зьніжэньне сабекошту.

Вытворчая камісія недастаткова разгарнула сваю работу у гэтым напрамку. За тры месяцы была толькі адна вытворчая нарада, не вядзецца ніякага вучоту соц. спаборніцтва і работ ударных брыгад.

Ударнік.

УДАР ПА АГЭНТАХ КЛЯСАВАГА ВОРАГА

ЧЫСТКА САВЕЦКАГА АПАРАТУ ВЫКРЫВАЕ ПРАВАДНІКОЎ КУЛАЦКІХ СПРАЎ

Комсамольскія ячэйкі, організуйце брыгады ў дапамогу чыстцы

НЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ КОМСАМОЛЬЦЫ

Комсамольскай ячэйкай Ляшнянскага с/с (Меншчына) нічога ня зроблена па удзелу ў чыстцы савецкага апарату, комсамольцамі ня выяўляліся факты злачынстваў ва установах, якія маюцца на абшарах сельсаветаў. На сходзе ячэйкі не абгаварвалася пытаньне аб чыстцы савецкага апарату, большасьць комсамольцаў не ўяўляе значэньня чысткі. У ячэйцы ставілася пытаньне аб організацыі групы „Лёгкай Кавалерыі", але гэта усё засталося на паперы.

Я. Карпаў.

Выкрылі падкулачнікаў

9 сьнежня ў Слабада-Кучанскім сельсавеце, Копыльскага раёну, адбылася чыстка савецкага і коопэрацыйнага апарату. У часе чысткі выявілася, што старшыня сельсавету Коршук, загадчык крамы Варэлік, палясоўшчыкі—Карачук і Пыліла, у сваёй працы зрасьліся з кулакамі, рабілі растраты і г. д. Камісія пры дапамозе працоўных мас сялянства выкрыла гэтых падкулачнікаў.

Верас.

Масы ўдзельнічаюць

У мястэчку Дукора (Меншчына) праходзіць чыстка савецкага апарату з вялікай зацікаўленасьцю і пры ўдзеле працоўных. Наведваюць праверачныя сходы комсамольцы. Заля, дзе праходзіць чыстка поўна народу, асабліва зацікаўлена чысткай бядняцкае сялянства і рабочыя, у прэзыдыум паступаюць запіскі з прапановамі выслаць з залі таго ці іншага чужога элемэнта, спэкулянта, кулака, якія з варожымі мэтамі заглядаюць на чыстку.

М. Чубар.

ДЗЯЖУРСТВЫ КОМСАМОЛЬЦАЎ

Па Дрыбінскім раёну (Аршаншчына) праходзіла паўторная чыстка савапарату. Пры кожным сельсавеце працавалі ўдарныя брыгады, якія знаёміліся з працай як сельсавету, так і прадпрыемстваў, выкрываючы новыя факты, якія ня былі выкрыты папярэдняй чысткай. Шмат у гэтым дапамаглі комсамольскія ячэйкі, і атрады „Лёгкай Кавалерыі". Устанаўлівалася комсамольцамі дзяжурства пры ўстановах, дзе даваліся спраўкі па пытаньнях чысткі і прымаліся матар'ялы ў камісію. У час чысткі наглядаліся выпадкі выступленьняў асабістага парадку, камісіяй гэта было ўлічана.

М. АРКАДЗЬ.

Як ён пралез у комсамол?

Бацька **Ліўшыца** займаўся ўвесь час талмудзтвам, г. зн. навучаў дзяцей беднейшых рабочых рэлігійным законам, абрадам, і браў з іх за гэта плату. Матка яго трымала да апошняга часу краму, займалася дробным гандлем у горадзе Менску. Патэнт яны бралі на імя брата. У горадзе Шацку ў іх быў уласны дом, які ў мінулым годзе прадалі. Адначасова яны займаліся хлебапячэньнем, скуплівалі лішкі ў сялян.

Паступаючы ў комсамол Ліўшыц захаваў свой сапраўдны твар, ён сказаў рабочаму працаваўшаму ў сталярнай тав. Кантаровічу, што цяпер, **калі я паступлю ў комсамол для мяне ўсе шляхі будуць адкрыты для выяўленьня праўды.**

Пытаньне,—ласьне толькі будучы комсамольцам можна ўзнаць праўду, а будучы беспартыйным нельга? Але-ж цікава было-б ведаць, аб якой-такой праўдзе думаў Ліўшыц.

У сувязі з праверкай шэрагаў ЛКСМ мне хочацца выкрыць сапраўднае паходжаньне Ліўшыца. Сям'я яго, на чале з ім, да яго паступленьня ў комсамол, не хацела мець нічога агульнага з рабочымі, заўсёды трымаліся ганарова, заўсёды групаваліся з гнілой інтэлігенцыяй, дробнай буржуазіяй, бо лічылі, што групаваньне з рабочымі для іх ганьба.

Цікава, ці ведала комсамольская ячэйка тое, што брат Ліўшыца быў спэкулянтам на чорнай біржы і якімсьці чынам пралез працаваць **у рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь"**, і цікава, як рэагаваў на гэтыя моманты „комсамолец" Ліўшыц. Але факты гавораць за ўсё, Ліўшыц пры паступленьні ў комсамол ні аб чым не гаварыў.

Аб гэтых фактах ведалі з 26 г. сябры КП(б)Б т. т. Левін і Кантаровіч, і комсамолец Нахмановіч, апошні заяўляў, але усё гэта прайшло міма.

Цяпер пытаемся, ці можа Ліўшыц застацца ў шэрагах комсамолу? Адказ можа быць простым,—безумоўна не. Я лічу, што цяпер ячэйка КСМ павінна заняцца гэтым пытаньнем і выявіць, якім чынам Ліўшыц трапіў на працу ў падсобныя майстэрні.

Зоркі.

У ЦВК БССР

Гаспадаркам, якія пацярпелі ад кулацкага тэрору, будзе аказвацца дапамога

Зацьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР пра дапамогу асобам і гаспадаркам, якія пацярпелі ад кулацкага тэрору.

Для паказанай мэты пры акрвыканкомах утвараюцца адпаведныя фонды. Вырашэньне пытаньня аб выдачы дапамог і іх размеры ўскладаецца на спэцыяльныя камісіі, якія ўтвараюцца пры акрвыканкомах. Пастановай дакладна вызначан парадак забесьпячэньня асоб якія скалечаны, і сямей асоб, якія памерлі ад кулацкага тэрору.

Аб змаганьні з дзіцячай бяспрытульнасьцю ў БССР

Гэтымі днямі сэкратарыят ЦВК заслухаў даклад Полацкага Акрвыканкому і садаклад Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі аб барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю ў Полацкай акрузе. За 1928-29 год па Полацкай акрузе была аказана матар'яльная дапамога 152 асобам на суму 1293 рублі 89 кап. Слаба ўцягнута грамадзкасьць у работу па барацьбе з бяспрытульнасьцю. Таварыства „Прыхільнік Дзяцей" працуе нездавальняюча, сетка ячэек зусім недастатковая. Для навучаньня дзяцей пэўнаму рамесьніцтву у Полаччыне існуе шэраг майстэрняў (шавецкая, сталярная, кравецкая, кузьні).

***

Зацьверджана палажэньне пра мерапрыёмствы для барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю ў БССР.

Згодна гэтага палажэньня, дакладна вызначана тая катэгорыя бяспрытульных дзяцей, якая патрабуе поўнага забясьпечаньня і выхаваньня з боку дзяржавы і тая катэгорыя, якая патрабуе абароны, часовай альбо частковай дапамогі.

Ажыцьцяўленьні ўсіх мерапрыемстваў для барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю ўскладаецца на Наркамасьветы, адпаведныя выканаўчыя камітэты і саветы. Аб'яднаньне дзейнасьці грамадзкіх організацый, якія вядуць барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю, ускладаецца на камісію палепшаньня жыцьця дзяцей пры ЦВК БССР.

Аб проэкце асноўных палажэньняў організацыі сельсаветаў у СССР

Сэкратарыят ЦВК, разгледзіўшы вынікі абгаварэньня ў БССР проэкту асноўных палажэньняў аб організацыі сельсаветаў у СССР, адзначыў, што ў сувязі з праядзеньнем у БССР працы па суцэльнай колектывізацыі, перад сельскімі саветамі вызначаюцца новыя задачы, якія грунтоўным чынам павінны зьмяніць палажэньне аб сельскіх саветах. Выходзячы з гэтага, сэкратарыят ЦВК узьняў перад ЦВК СССР хадайніцтва аб адтэрмінаваньні абмеркаваньня проэкту на $1^1/_2$-2 месяцы з тым, каб мець магчымасьць за гэты час вывучыць задачы і ролю сельсаветаў у раёнах суцэльнай колектывізацыі. Заўвагі, прынятыя нарадай, якая адбылася ў часе сэсіі ЦВК, а таксама заўвагі з месц па проэкту пастаноўлена паслаць у ЦВК СССР, як матар'ял.

Месячнік ашчаднасьці

Сэкратарыят ЦВК пастанавіў правесьці месячнік ашчаднасьці, у мэтах узмацненьня паступленьня ўкладаў у касы ашчаднасьці.

ЮНКОРЫ ПІШУЦЬ

* Два месяцы прайшло пасьля перавыбараў бюро КРУГЛЯНСКАЙ ЯЧЭЙКІ ЛКСМБ (Круглянскі р-н), а сходаў яшчэ ня было ні аднаго. Палітвыхаваньнем комсамольцы не займаюцца.

За чым-жа сочыць райком?

КОМСАМОЛЕЦ.

Сэкратар ГАРОЧЫЦКАЙ ЯЧЭЙКІ МАСКАЛЕВІЧ ВАСІЛЬ ПРЫ ОРГАНІЗАЦЫІ КОЛГАСУ ЎСТУПІЎ ПЕРШЫМ У ЯГО, ЁН ТАМ ПРАВОДЗІЦЬ ПОЛІТ-ВЫХАВАЎЧУЮ ПРАЦУ І ЎЦЯГВАЕ Ў КОЛГАС НЕОРГАНІЗАВАНУЮ МОЛАДЗЬ ВЁСКІ.

ЦІШКЕВІЧ СЬЦЯПАН.

* ПРЫ КАПАТКЕВІЦКІМ НАРДОМЕ ёсьць бібліатэка, але яна бывае адчынена толькі раз у паўгода. Загадчык апошняй ГАНУСЕВІЧ дарэмна атрымоўвае грошы нічога ня робячы.

Што на гэта адкажа праўленьне Нардому?

МЯТЛЮК.

* Комсамольцы БЫСТРЫЦКАЙ ЯЧЭЙКІ (КАПЫЛЬШЧЫНА) сярод насельніцтва разгарнулі работу па колектывізацыі. Есьць значны зрух у гэтай рабоце.

Пры ячэйцы організаваны лікпункт, які наведваюць 34 няпісьменных. На ячэйку куплена колектыўна адна аблігацыя за 25 рублёў. Кожны комсамолец выпісвае „ЧЫРВОНУЮ ЗЬМЕНУ" расьце ячэйка выключна за лік беднякоў.

ПРАВІДЛОВЫ.

* У ЗАРАСЬНЯНСКАЙ ЯЧЭЙЦЫ КСМ (Ліозьнянскага раёну) налічваецца 17 комсамольцаў, якія ніякай работы ў ячэйцы не вядуць. Партячэйка гэтага ня бачыць і не рэагуе.

ЯРКА.

З фото-апаратам па Менску



Зараз на Беларусі праходзіць трохмесячнік беларускай пролетарскай культуры. У сувязі з гэтым культурныя ўстановы падводзяць вынікі культурнай работы. На здымку новая выстаўка кніжак Цэнтральнай кнігарні БДВ у Менску.

Забраць зямлю ад служакоў рэлігійных культаў

Наркамзем Беларусі ўнесен проект у СНК і ЦВК БССР аб спыненьні надзяленьня зямлёй служакоў рэлігійных культаў. Усе землі, якія знаходзяцца ў карыстаньні служакоў рэлігійных культаў трэба забраць і перадаць у карыстаньне саўгасаў, ...саў, школ і г. д. Работа па ...раньню гэтых зямель—гаворыць ў проекце—павінна быць ускладзена на райвыканкомы і закончыцца да ...шага сакавіка 30 г.

ХОД КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПЕРАВЫСІЎ ПЛЯНЫ

ГОМЕЛЬ, 29. Ход колектывізацыі перавысіў вызначаныя пляны. У акрузе колгасамі занята плошча ў 210 тысяч га.

Да вяснавой сяўбы два раёны пераходзяць на суцэльную колектывізацыю. Прыступлена да распрацоўкі плянаў організацыі трох агракомбінатаў.

Брыгада спэцыялістаў у акругі

Гэтымі днямі ў акругі БССР ...яжджае брыгада спэцыялістых ...камзему Беларусі ў ліку 16 ч... для дапамогі па падрыхтоўцы д... вядзеньня вясеньняй пасяўной ...паніі.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Царыку. — Допіс „Каму патрэбны такія кнігі", ня пойдзе. Можна вырашыць гэта пытаньне на месцы.

Чаромуху. — „Кулакі на адказнай працы настаўнікаў" пераслана на расьследваньне ў адпаведныя органы. Аб выніках паведамім.

Белінкову. — „Правідлова зрабілі", друкавацца ня будзе. Аб гэтым ужо ёсьць пэўная пастанова.

Зязюле.—Допіс „Радыё для інтэлігэнцыі" перасланы для прыняцьця адпаведных захадаў у радыё-цэнтр Беларусі.

Фінкельштэйну.—„Карцежнікаў на чорную дошку", **Ведаючаму**—„Сьвядомы рабкор", **Калчадаеву**—„Бюрократызм вучкому 1 й вузьдзенскай сямігодкі". Гэтыя допісы перасланы ў адпаведныя органы для прыняцьця мер.

Самазнайку—„Калі студэнты стануць культурнымі", **Гэрчыкаву**—„Ай да і партыец". Напішэце аб гэтым у насьценгазэту.

Зорцы—„Цацкаюцца", **Селькору** „Ці справідлова гэта", **Зоркаму**—„Ня месца белахоўцам-пазбаўленцам у колгасе", **Уласаву Р.**—„Растратчык", **Цярэшку**—„Папаў пад крыло кулакоў", **Чучаку Юсусару**—„Хто спыніць бясчынствы ў Семкава-Гарадзецкім мэдпункце", **Комсамольцу**—„Сунімеце хулігана Верамейчыка", **Цікаваму**—„Ці месца яму там", **Чубарыку**—„Зжыўся з чужымі элемэнтамі", **Мятлюку**—„Патрэбна ўручыць патэнт", „лёгкай кавалерыі" ненармальнае зьявішча" і „Дзе астатнія грошы", **Дынгу**—„Пагнаць яго з комсамолу", **Кавалерыстаму**" „Аб чужых у комсамоле". Гэтыя допісы накіраваны ў належныя організацыі для расьсьледваньня і прыняцьця мер.

Супрацоўнікам Белбудтрэсту—Ваш ліст накіраван у Мен. АВК для вырашэньня гэтай справы.

Ярмаку—Допіс „Ці месца так... тэхнікуме" ня пойдзе. Ставіць пытаньне на абгаварэньне бес... на, лепш дзейнічаць праз мяс... організацыі.

Лайхтману Ф.—„Праца занеп...", **Букчыну В.**—„Працу трэба нала...", **Мятле**—„Аб правым ухіле на пр...цы", **Пазьняку В.** — „Аб вечар... факу с-г Акадэміі", **Уласаву**—„Х...", **Сільванцу** — „Насільна заста... працаваць", **Ерамееву П.**—„Ба... выключаюць", **Лісоўскаму** — „А... сьценгазэце пры Стара-Барыс... с-г тэхнікуме"—гэтыя допісы ...ваны ў належныя ўстановы для сьледваньня і прыняцьця мер.

Пальчэўскаму — „У карысьць культуры", **П.**—„Зрываюць фі...турныя заняткі", **Н. Маркоўскаму** ...старце пераломy",—вашы допісы ...кавацца ня будуць, перадайце ў насьценгазэту.

Тарасэвічу—„На правідловым ...ху", **Купрэяву А.**—„Прарэхі ў к...мольскай організацыі 2-ой ба... **М. Сацунковічу** — „На сходзе ... КСМ 1-й роты АБВШ", **Буя... Савінічу**—„Твар ячэйкі"—допісы ...кавацца ня будуць, так як аб не...рых фактах ужо пісалі, а нека... дробныя.

А. С. „Замест сынагогі—куль...ва", **Хацкевічу**—„У паходзе за ...люцыйную тэорыю". **Белянкаву** ...Селецкай ячэйцы КСМ" — дру... ня будзем. Допісы ня маюць ка...насьці, бо прыведзены вельмі др...ныя факты.

Адказны рэдактар
А. Джэл...

Менск, друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599